**Ганна Савіч**

***

*Які ж балючыя расстанні!*
*Ты пакідаеш родны кут,*
*У твой бок глядзяць расчаравана*
*Узлескі, хаты, шумны дуб.*
*А ў гаі каліна спее і вочкі*
*Долу апусціла,*
*Як жа яна ўсё разумее*
*І ўтрымаць не мае сілы.*
*Мяне прабачце, дарагія,*
*За ўсё ўдзячна вам і Богу,*
*Ды ёсць сярод шляхоў іншыя*
*Сцяжынкі і мая дарога.*
*Абавязкова я ж вярнуся!*
*А лёсу сцежкі ёсць ўсюды,*
*Няхай да роднай Беларусі*
*Ён з кветак васількобых будзе.*
*Дай Божа,*
*у тлуме майго шляху*
*Каб не губляліся сцяжыны,*
*Птушыны клёкат,*
*Крылаў узмахі — знак*
*Павяртання да краіны.*
*Каб толькі чыстым было неба,*
*Вясёлкай праганяла хмары,*
*Для шчасця многа нам*
*не трэба,*
*Здзяйсненне, хіба, толькі мары!*